Источник: "Настаўніцкая газета" - 2017-04-18

**Сёння сусветная супольнасць адзначае Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных месцаў. З гэтай нагоды надоечы адбылася прэс-канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства культуры і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, навуковай супольнасці краіны, якія падзяліліся з журналістамі пэўнымі вынікамі дзяржаўнай і грамадскай актыўнасці ў галіне аховы помнікаў і гістарычных месцаў апошняга часу, а таксама планамі ў гэтай галіне на бягучы год.**

Так, па словах начальніка аддзела па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталлі Хвір, у 2016 годзе галіновым міністэрствам было выдадзена 732 дазволы на правядзенне навукова-даследчых і рэстаўрацыйных работ, прыстасаванне аб'ектаў спадчыны пад новыя функцыі, было складзена 106 заключэнняў аб уводзе такіх аб'ектаў у эксплуатацыю.

# Рэстаўрацыя адбываецца і чакаецца

На працягу мінулага года быў завершаны цэлы шэраг праектаў: другая чарга рэстаўрацыі Свята-Пакроўскага жаночага манастыра ў Талачыне, першая чарга рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ касцёла Божага Цела ў Нясвіжы, работы на мемарыяльным комплексе "Прарыў" ва Ушацкім раёне, на будынку Віцебскага народнага вучылішча, звязанага з імёнамі Марка Шагала і Казіміра Малевіча, чарговы этап рэстаўрацыі капліцы-спачывальні Паскевічаў у Гомелі. У 2016 годзе вяліся работы па ўладкаванні інжынерных сетак у Косаўскім замку, урочышча Чырвоны Двор Іванаўскага раёна, па рэстаўрацыі ўсходняга корпуса Палаца Сапегаў у Ружанах, была распрацавана праектная дакументацыя на мемарыяльны комплекс "Трасцянец". У мінулым годзе таксама адбылася рэканструкцыя ўрочышчаў Благаўшчына і Шашкаўка, якія ўваходзілі ў лагер смерці Трасцянец. На сённяшні дзень працягваюцца работы на такіх знакавых аб'ектах, як Любчанскі замак, сядзіба палацава-паркавага ансамбля ў Смілавічах Чэрвеньскага раёна, палацава-паркавы комплекс у вёсцы Жылічы Кіраўскага раёна, асабняк 1812 года ў Бабруйску і інш.

23 сакавіка гэтага года, адзначыла Наталля Хвір, у Міністэрстве культуры адбылося пасяджэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. На ім былі разгледжаны і адобраны заяўкі на фінансаванне творчых праектаў 2017 года. Гэта капітальны рамонт Свята-Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродне, рэстаўрацыя адслоенага жывапісу XVIII—XIX стагоддзяў Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку шляхам таніравання, часовая кансервацыя Княжацкай вежы гісторыка-культурнай каштоўнасці "Рэшткі замка XVI стагоддзя ў вёсцы Крэва Смаргонскага раёна".

На бягучых надзённых справах у галіне аховы помнікаў і гістарычных месцаў засяродзілася ў сваім выступленні загадчык Цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вольга Ляўко. У прыватнасці, як паведаміла Вольга Мікалаеўна, згодна з пратаколам даручэнняў кіраўніка дзяржавы № 33 ад 2 снежня 2016 года, дадзеных ім у ходзе яго рабочай паездкі ў лістападзе мінулага года ў Віцебскую і Магілёўскую вобласці, у лютым — красавіку 2017 года ажыццяўляецца добраўпарадкаванне набярэжнай левага берага ракі Дняпро і Пятроўскага вала ў гарадскім пасёлку Копысь. Рэканструкцыя тут праводзіцца на аснове плана Копысі 1665 года. "Зыходзячы з гэтага плана мы вызначылі зоны размяшчэння старажытных вежаў і вырашылі з боку ракі Дняпро ўсталяваць тры вежы, — адзначыла навуковец. — Дзве з іх мы паставім на самім гарадзішчы, а адну ля падножжа гарадзішча — яна будзе паказваць кут гарадской сцяны, якая атачала тэрыторыю Копысі. Сёння там знаходзяцца нашы археолагі, якія суправаджаюць усе земляныя будаўнічыя работы, а работы там вельмі маштабныя. Там па ўсім горадзе пракладваюць газ, водаправод, новае палатно дарогі і г.д. Таксама на ўездзе на гарадзішча будзе адноўлена ўязная брама, будуць выкладзены дарожкі ў адпаведнасці з іх выглядам у XVII стагоддзі. А на самім гарадзішчы паўстане элемент, які будзе фіксаваць зону размяшчэння панскага дома".

Розныя аспекты праблемы аховы гісторыка-культурнай спадчыны закранулі таксама начальнік аддзела горадабудаўніцтва галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь Таццяна Гаўрыленка, загадчык аддзела архітэктуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Таццяна Гаранская, загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры і старшы навуковы супрацоўнік ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, адпаведна, Барыс Лазука і Таццяна Кухаронак.

Прадстаўнікі СМІ, безумоўна, не маглі не скарыстацца магчымасцю і не спытаць у кампетэнтных асоб пра сітуацыю вакол мемарыяла "Курапаты", якая сёння прыкметна хвалюе беларускае грамадства. Як паведаміла Наталля Хвір, у Мінкультуры паступілі першыя заяўкі на конкурс эскізных праектаў памятнага знака ва ўрочышчы Курапаты. Прыём заявак будзе ажыццяўляцца да 26 красавіка. Падрабязная інфармацыя аб правядзенні конкурсу размешчана на сайце Міністэрства культуры ў рубрыцы "Конкурсы і мерапрыемствы".

**Мікола ЧЭМЕР.**

Мікола Чэмер. Рэстаўрацыя адбываецца і чакаецца